ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі ўніверсітэт



№ 1 (975) | ПЯТНІЦА, 28 студзеня 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## 30 СТУДЗЕНЯ — ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ

**У НУМАРЫ:**

- **Аб важкіх здабытках вучоных ГДУ**
- **Распрацоўкі кафедры -- у народную гаспадарку**
- **Дыпломы... з Швецыі**
- **Вучэбны працэс -- бліжэй да практыкі.**

## НА РУБЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ

**Д.ЛІН,**
**прарэктар па навуковай рабоце, прафесар**

Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, які адзначыў у мінулым годзе сваё 30-годдзе і 70-гадоў з дня ўтварэння педінстытута, на базе якога ён узнік, з'яўляецца адной з вядучых вну ў нацыянальнай сістэме адукацыі не толькі гомельскага рэгіёна, але і Беларусі ў цэлым.

Адным з галоўных паказчыкаў любога універсітэта з'яўляецца яго навуковая дзейнасць. Навуковыя даследаванні ў ГДУ вядуцца па 18 накірунках, якія з'яўляюцца адначасова прыярытэтнымі і па Рэспубліцы Беларусь.

Універсітэт мае дастаткова высокі кадравы патэнцыял. Тут на канец 1999 года працавала больш за 590 навукова-педагагічных супрацоўнікаў, у іх ліку 30 дактароў і 232 кандыдаты навук. Ва універсітэце дзейнічае аспірантура, якая ў мінулым годзе была значна пашырана: уведзена 17 новых спецыяльнасцяў і зараз прыём у аспірантуру ажыццяўляецца па 55 спецыяльнасцях. У 1999 годзе рашэннем калегіі ВАК Беларусі пры ГДУ быў адкрыты рэгіянальны савет па абароне кандыдацкіх дысертацый па дзвюх спецыяльнасцях: палітэканомія і эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай. Усяго ва універсітэце дзейнічае 5 саветаў па 7 спецыяльнасцях.

У буйнейшай вну Беларускага Палесся сфарміраваліся і паспяхова развіваюцца навукова-педагагічныя школы па актуальных накірунках даследаванняў. Сярод іх найбольш эфектыўнымі можна назваць такія, як шырока вядомая Гомельская школа алгебраістаў пад кіраўніцтвам рэктара універсітэта члена-карэспандэнта НАН Беларусі Л.А.Шамяткова; па оптыцы і акустыцы крышталяў, фатоніцы і квантавай электроніцы, створаная акадэмікам Б.В.Бокуцем, якая развіваецца пад кіраўніцтвам члена-карэспандэнта НАН Беларусі А.М.Сердзюкова; па стварэнню новых перспектыўных матэрыялаў, узначальваемая аўтарам публікацыі і прафесарам І.М.Мельнічэнкам; па фізіцы высокіх энергій і элементарных часціц пад кіраўніцтвам прафесара М.В.Максіменкі; па камп'ютаметрыі і імітацыйнаму мадэліраванню вылічальных сістэм пад кіраўніцтвам прафесара І.В.Максімея; па фітацэналогіі лугавых экасістэм пад кіраўніцтвам прафесара Л.М.Сапегіна; эканамічнай тэорыі і метадалогіі эканамічнай навукі пад кіраўніцтвам прафесара М.В.Навучыцеля; па беларускай лексікаграфіі пад кіраўніцтвам прафесара У.В.Анічэнкі; па духоўнай спадчыне Гомельскага Палесся пад кіраўніцтвам прафесараў І.Ф.Штэйнера і А.А.Станкевіч; па праблемах маральнага выхавання вучняў у агульнаадукацыйнай школе пад кіраўніцтвам акадэміка І.Ф.Харламава.

Галоўнай задачай навуковай дзейнасці універсітэта з'яўляецца развіццё фундаментальнай навукі. Такія работы выконваюцца па міжвузаўскіх і дзяржаўных праграмах фундаментальных даследаванняў (прыкладна 25% тэматыкі). У 1999 годзе універсітэт заключыў з НАН Беларусі генеральны дагавор аб творчым супрацоўніцтве. У рамках рэалізацыі гэтага дагавора ГДУ цяпер заключае дагаворы з Інстытутамі Акадэміі, якія прадугледжваюць стварэнне навуковых лабараторый двайнога падпарадкавання, навукова-вучэбных цэнтраў, сумесных малых прадпрыемстваў, часовых навуковых калектываў, філіялаў кафедр і інш. Разам з тым універсітэт не стаіць у баку і ад надзённых прыкладных праблем народнай гаспадаркі краіны. Каля 15% аб'ёму НДР прыходзіцца на выкананне заданняў дзяржаўных навукова-тэхнічных праграм. ГДУ актывізаваў сваю дзейнасць па ўдзелу ў рашэнні рэгіянальных навукова-тэхнічных праблем. Зараз ён прыступіў да выканання трох заданняў па рэгіянальнай навукова-тэхнічнай праграме Гомельскай вобласці. З усяго аб'ёму фінансавання праграмы на ГДУ прыходзіцца больш 40%.

Да рэгіянальных навуковых даследаванняў адносяцца таксама даследаванні па гісторыі і культуры Гомельшчыны, вывучэнню творчай спадчыны вядомага вучонага М.В.Доўнар-Запольскага — ураджэнца г.Рэчыцы. Гэтыя работы фінансуюцца з боку аблвыканкома, Міністэрства адукацыі і Рэчыцкага гарвыканкома. Вывучэнне гісторыі і культуры роднага краю ажыццяўляецца комплексна, з выдзяленнем наступных аспектаў: фальклорнага, лінгвістычнага, гістарычнага, этнаграфічнага і краязнаўчага. За год работы над культурна-гістарычнай праграмай падрыхтавана да друку 16 манаграфій і кніг.

Усяго па праграмах усіх узроўняў выконваецца больш паловы тэматыкі, на якую расходуецца каля 60% фінансавых сродкаў.

Рэзультатыўнасць навуковых даследаванняў ГДУ дастаткова высокая. За 1999 год ва універсітэце выдадзена 20 манаграфій, 10 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў з грыфам міністэрстваў і ведамстваў, супрацоўнікамі і аспірантамі абаронены 2 доктарскія і 14 кандыдацкіх дысертацый, пададзена 7 заявак на вынаходніцтвы. Падтрымліваецца ў дзеянні 32 патэнты, паступаюць плацяжы за продаж ліцэнзій па двух дагаворах, шматлікія распрацоўкі універсітэта ўкаранёны ў вытворчасць. Аб'ектамі ўкаранення з'яўляюцца лазерныя тэхналогіі і абсталяванне для тэрмічнай апрацоўкі матэрыялаў, рэзкі, пайкі і зваркі металаў; тэхналогіі атрымання камбінаваных вырабаў з керамікі, шкла і палімераў; інфармацыйныя тэхналогіі; геалагічныя праекты абароны паверхневых і грунтовых вод ад забруджвання і інш. Гэтаму садзейнічае створанае ва універсітэце дзяржаўнае малое прадпрыемства "Сучасныя лазерныя тэхналогіі".

У 1999 годзе ГДУ быў ініцыятарам і ўдзельнікам арганізацыі і правядзення 5 міжнародных, 8 рэспубліканскіх і 13 унутрывузаўскіх навуковых канферэнцый, прыняў удзел у шэрагу рэспубліканскіх і міжнародных выставак.

**(Заканчэнне на 2-стар.)**

## ВІНШУЕМ!

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў філалагічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры беларускай мовы **СТАНКЕВІЧ** Аляксандру Аляксандраўну з прысваеннем ёй ВАК Беларусі вучонага звання прафесара.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў філалагічнага факультэта горача віншуюць загадчыка кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства **КОВАЛЯ** Уладзіміра Іванавіча з прысуджэннем яму ВАК Беларусі вучонай ступені доктара філалагічных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры матэматычных праблем кіравання горача віншуюць старшага выкладчыка **ДЗЕМУСЬКОВА** Аляксандра Барысавіча і аспірантку кафедры **ЛЯЎЧУК** Алену Аркадзьеўну з паспяховай абаронай дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі горача віншуюць асістэнта кафедры **АГЕЕНКА** Ірыну Уладзіміраўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата тэхнічных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры беларускай мовы горача віншуюць асістэнта кафедры **МІНАКОВУ** Людмілу Мікалаеўну з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук.

***

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў факультэта фізічнай культуры горача віншуюць дацэнта кафедры ТМФК **ЦАРЫКАВА** Барыса Андрэевіча з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата педагагічных навук.

## СТАЛІ ЛАЎРЭАТАМІ ПРЭМІІ

**На кафедры беларускай літаратуры — прыемныя навіны. Прычым, адбылося цікавае супадзенне: выкладчыца і нядаўняя студэнтка філалагічнага факультэта напярэдадні Новага года сталі адначасова пераможцамі ў розных конкурсах.**

Штотыднёвік "Літаратура і мастацтва" па добрай традыцыі вызначае аўтараў лепшых публікацый выдання за год. Названы лаўрэаты прэміі "ЛіМа" і СП "Белая вежа" за адышоўшы 1999 год у чатырох намінацыях — публіцыстыка, крытыка, паэзія, проза.

Дацэнт кафедры беларускай літаратуры Вольга Карпаўна Шынкарэнка, якая актыўна супрацоўнічае з газетай "Літаратура і мастацтва", стала лаўрэатам па раздзелу "Крытыка" за рэцэнзіі "Зіхоткасць сціплае душы", № 16, "Шукаць суладдзя", № 49.

А асістэнту кафедры Юліі Сальнікавай, якая ў мінулым годзе закончыла філалагічны факультэт, прысуджана прэмія Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі за лепшую студэнцкую навуковую работу па выніках конкурсу 1999 года. Яе тэма — "Трагічнасць эпохі ў сучаснай беларускай прозе" (навуковы кіраўнік — В.К.Шынкарэнка).

## АСПІРАНТАМ — СТЫПЕНДЫІ ЎРАДА

Падведзены вынікі праведзенага конкурсу па прысуджэнню стыпендый Урада Рэспублікі Беларусь для аспірантаў на 2000 год. Сярод яго пераможцаў — шэсць аспірантаў ГДУ імя Ф.Скарыны. Гэта: Аляксей **ФЕДАРЦОЎ**, аспірант спецыяльнасці "Вылічальныя машыны, комплексы, сістэмы і сеткі" (навуковы кіраўнік кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт В.Л.Мярэжа); Валянціна **БОНДАРАВА** ("Прымяненне вылічальнай тэхнікі, матэматычнага мадэліравання і матэматычных метадаў у матэматычных даследаваннях", навуковы кіраўнік В.Л.Мярэжа); Дзмітрый **КАЗЛОЎ** ("Палітычная эканомія", навуковы кіраўнік кандыдат эканамічных навук, дацэнт Б.У.Сарвіраў); Таццяна **КУРАШОВА** ("Эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай", навуковы кіраўнік кандыдат эканамічных навук, дацэнт У.П.Бабына); Кацярына **ХАЗАНАВА** ("Беларуская мова", навуковы кіраўнік доктар філалагічных навук, прафесар У.В.Анічэнка); Кірыл **РАМАНАЎ** ("Тэорыя і методыка фізічнага выхавання, спартыўнай трэніроўкі і аздараўленчай фізічнай культуры", навуковы кіраўнік кандыдат педагагічных навук, дацэнт В.А.Мядзведзеў).

Памер урадавай стыпендыі складае 10 мінімальных заработных плат.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння Ганаровай граматай універсітэта ўзнагароджана дацэнт кафедры беларускай літаратуры **СМЫКОЎСКАЯ** Валянціна Іванаўна.

**Хроніка**

## НОВЫЯ НАЗНАЧЭННІ

Загадам па універсітэту на пасаду прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце назначаны **НАВУМЕНКА** Пётр Мікітавіч, які раней працаваў начальнікам эксплуатацыйна-тэхнічнага аддзела.

***

Загадам па універсітэту на пасаду начальніка аддзела выхаваўчай работы з моладдзю назначаны **ВАРОНІН** Генадзь Іванавіч, які раней працаваў рэжысёрам культурнага цэнтра ГДУ.

# НА РУБЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-стар. )

ГДУ падтрымлівае творчыя сувязі з шэрагам навуковых арганізацый блізкага і далёкага замежжа: Інстытутам фундаментальных і прыкладных праблем Польскай акадэміі навук, Аб'яднаным інстытутам ядзерных даследаванняў (г.Дубна), Вышэйшай тэхнічнай школай у г.Кілі (Германія), Моўным Цэнтрам Брасхауз (Вялікабрытанія), Янчжоўскім універсітэтам (КНР), Сюйчжоўскім педагагічным універсітэтам (КНР), Беластоцкім політэхнічным інстытутам (Польшча), Овернськім універсітэтам (Францыя), электрамагнетычнай лабараторыяй Хельсінскага тэхналагічнага універсітэта (Фінляндыя), Балтыйскім універсітэтам (Швецыя), Украінскім дзяржаўным навукова-даследчым інстытутам архіўнай справы і дакументазнаўства (г.Кіеў, Украіна), Бранскім дзяржаўным педагагічным універсітэтам (Расія), НДІ "Зеніт" (г.Масква, Расія) і інш.

Вучоныя універсітэта прымаюць удзел у распрацоўцы праектаў міжнародных праграм, у прыватнасці, INTAS.

У ГДУ актыўна прыцягваюцца да навуковай дзейнасці студэнты. Кожны год тут праводзіцца студэнцкая навуковая канферэнцыя з публікацыяй тэзісаў лепшых дакладаў. Акрамя таго, студэнты выступаюць з навуковымі дакладамі і на міжнародных, рэспубліканскіх канферэнцыях або самастойна, або ў сааўтарстве з выкладчыкамі. За 1997-1999 гг., напрыклад, студэнтамі падрыхтавана 1900 дакладаў, апублікавана больш за 750 навуковых матэрыялаў. У конкурсах навуковых работ студэнты ГДУ атрымліваюць дастаткова высокую ацэнку. Напрыклад, у конкурсе работ 1999 года 30 даследаванняў атрымалі ўзнагароду.

НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ -- У ПРАКТЫКУ

# КАЛЕКТЫЎ МОЦНЫ СВАІМ КІРАЎНІКОМ

Я заўсёды была ўпэўнена: прафесія геолага – не для жанчын. Суровыя, паходныя ўмовы ў палявых экспедыцыях, дзе патрэбны і сіла, і вынослівасць, і цвёрдасць характару, больш падыходзяць для моцнай паловы чалавецтва. Але вось перада мной абаяльная, прывабная жанчына – загадчыца кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў Алена Юр'еўна Трацэўская, агульны стаж у геалогіі якой складае больш двух дзесяцігоддзяў...

— А я не лічу геалогію прэрагатывай мужчын, — з усмешкай перапыняе яна мае разважанні. І каб даказаць памылковасць маёй думкі, робіць невялікі экскурс у гісторыю. Потым дадае: "Цяпер ва ўсім свеце жанчыны пачалі займацца працай, якая раней лічылася толькі мужчынскай. І спраўляюцца з ёй не горш за іх, толькі ўжо сваімі, менавіта жаночымі спосабамі – міралюбствам, гібкасцю, стваральнай энергіяй".

Загадчыцай кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў ГДУ дацэнт А.Ю.Трацэўская стала нядаўна – яшчэ і года не прайшло. Але за гэты адносна невялікі адрэзак часу яна паспела ўшчыльную "ужыцца" у справы і праблемы кафедры, што, здаецца, працавала тут заўсёды. А перад гэтым была вучоба тут, на геафаку універсітэта, аб чым марыла яшчэ са школьных гадоў, пасля — праца інжынерам-картографам, потым выкладчыцкая дзейнасць у Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, дзе прайшла шлях ад асістэнта да дацэнта, скончыўшы завочна аспірантуру на кафедры інжынернай геалогіі МДУ імя М.В.Ламаносава пад кіраўніцтвам акадэміка В.І.Осіпава.

Яна з вялікай удзячнасцю прыгадала тых выкладчыкаў геафака ГДУ, у якіх вучылася не толькі прафесійным ведам, але і жыццёвай мудрасці, — дацэнтаў А.А.Недавізіна, Л.Д.Мядзведзева, М.А.Жураўля, М.Ф.Паўлава, якога ўжо, на жаль, няма сярод нас.

Узначальваць кафедру, якая за 30 гадоў свайго існавання набыла багатыя і выдатныя традыцыі, з'яўляецца самай старэйшай кафедрай геалагічнага профілю ў рэспубліцы, канешне, не вельмі лёгка, бо адчуваеш вялікую адказнасць і за калектыў, і за яго справы. Алена Юр'еўна як кіраўнік, вучоны-практык добра разумее і важнасць падрыхтоўкі для рэспублікі высокакваліфікаваных кадраў геолагаў, і надзённую неабходнасць правядзенння навуковай работы на карысць народнай гаспадаркі. На кафедры пануюць творчы дух, ініцыятыва, адсюль тут шмат цікавых задум, праектаў, планаў. Многія з іх даўно паспяхова рэалізоўваюцца, як, напрыклад, у лабараторыі матэматычнага мадэліравання геафільтрацыйных і геаміграцыйных параметраў, якую ўзначальвае дацэнт В.Г.Жогла. Яе супрацоўнікі вядуць работу па маніторынгу падземных вод г.Гомеля ў зоне водазабораў і хімзавода. Яшчэ адзін напрамак прыкладнога значэння, над якім працуюць на кафедры, -- вывучэнне дыфузійных і асматычных працэсаў у грунтах. З яго, у сваю чаргу, вычленілася новая галіна навуковых даследаванняў — геанургалогія, г.зн. ачыстка грунтоў ад забруджвання. Па ёй цеснае супрацоўніцтва кафедра завязала з МДУ, у стадыі хуткай рэалізацыі — таксама заключаны па гэтай жа тэме дагавор з ВА "Беларуснафта".

У рамках рэгіянальнай навукова-тэхнічнай праграмы Гомельскай вобласці калектыў кафедры пачынае працу над праектам, які на сённяшні дзень не мае аналагаў як на Гомельшчыне, так і ў рэспубліцы. Ён накіраваны на рацыянальнае выкарыстанне геалагічнага асяроддзя г.Гомеля, што ў канчатковым выніку прывядзе да зніжэння затрат на вышук, праектаванне, эксплуатацыю, капітальны рамонт і рэканструкцыю будынкаў і збудаванняў за кошт абагульнення маючыхся і нанава атрыманых інжынерна-геалагічных матэрыялаў і ўліку змяненняў уласцівасцей геалагічнага асяроддзя пад уплывам тэхнагенных нагрузак. Асноўная задача вучоных — стварыць банк дадзеных інжынерна-геалагічных умоў г.Гомеля і на гэтай падставе зрабіць картаграфічную мадэль геалагічнага асяроддзя абласнога цэнтра.

Наладжваюцца таксама цесныя творчыя кантакты кафедры з далёкім замежжам — Нацыянальным Саветам даследаванняў Італіі, у якім разам з маскоўскімі калегамі гамяльчане па заключанаму трохбаковаму пагадненню будуць даследаваць водныя рэсурсы і няўстойлівасць зямель, ёсць таксама дамова аб супрацоўніцтве з універсітэтам шведскага горада Упсала.

Шмат дзелавых партнёраў мае кафедра і ў нашай рэспубліцы.

Творчы патэнцыял вучоных прыносіць належную аддачу на практыцы і гэта Алену Юр'еўну Трацэўскую радуе і абнадзейвае.

**Т.ДУБЯК.**

# АБ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАЙ ТВОРЧАСЦІ МОЛАДЗІ

Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Беларусі, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы правялі семінар для прадстаўнікоў вну Беларусі на тэму: "Вывучэнне сацыяльна-гуманітарных навук у вну як форма інтэлектуальнай творчасці моладзі".

У час работы семінара яго ўдзельнікі заслухалі даклады нам. міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь прафесара А.Г.Слукі "Грамадазнаўства XXI стагоддзя: ад накаплення ведаў да творчай рэалізацыі інтэлекту", галоўнага саветніка Адміністрацыі Прэзідэнта РБ П.І.Бондара — "Выкладанне грамадскіх навук: праблемы арганізацыі інтэлектуальнай творчасці студэнтаў і навучэнцаў", прарэктара Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы А.В.Макарава — "Стандарты і праграмнае забеспячэнне выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін", а таксама паведамленне загадчыка кафедры паліталогіі Белдзяржуніверсітэта, прафесара С.В.Рашэтнікава "Метадычнае абгрунтаванне структуры курса паліталогіі ў вну".

Паміж удзельнікамі семінара адбыўся шырокі абмен думкамі па абмяркоўваемай тэме.

Замежныя кантакты

# БЛІЖЭЙ СТАНОВІЦЦА ДАЛЁКІ КІТАЙ

З вышэйшымі навучальнымі ўстановамі Кітайскай Народнай Рэспублікі наш універсітэт супрацоўнічае ўжо даўно – з 1991 года. Пачатак навуковым, культурным кантактам з імі быў пакладзены падпісаннем дагавора аб супрацоўніцтве паміж ГДУ і Пекінскім сталічным педагагічным універсітэтам. Цяпер геаграфія сувязей з далёкай краінай пашырылася. Наладжаны цесныя кантакты з Янчжоўскім педагагічным інстытутам. Праводзіцца абмен дэлегацыямі гомельскіх і кітайскіх вучоных, іх стажыроўка. Каля 40 юнакоў і дзяўчат з КНР праходзяць падрыхтоўку на эканамічным, філалагічным і матэматычным факультэтах.

А напярэдадні 2000-га года ГДУ прымаў новых гасцей з Кітая – з універсітэта горада Сюйчжоу. Гэта буйная шматпрофільная навучальная ўстанова, дзе займаюцца звыш 10 мільёнаў студэнтаў. Дэлегацыя з гэтай вну ў складзе рэктара, прафесара-біёлага і сакратара міжнароднага аддзела прыбыла ў ГДУ для падпісання двухбаковага дагавора аб супрацоўніцтве. Госці азнаёміліся з нашым універсітэтам, наведалі фізічны факультэт, яго лабараторыі, мелі гутарку з прафесарска-выкладчыцкім саставам біяфака. Кітайскі прафесар выступіў з лекцыяй аб уплыве лекавых раслін на арганізм чалавека і жывёлін перад студэнтамі факультэта фізічнай культуры, якія спецыялізуюцца на кафедры АЛФК.

Знаёмства далёкіх гасцей з Беларуссю працягвалася ў нашай сталіцы – у г.Мінску, дзе яны наведалі Белдзяржуніверсітэт, сустрэліся з яго прарэктарам па міжнародных сувязях У.А.Астапенкам.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

# ЁСЦЬ У КАГО ПАВУЧЫЦЦА

Доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай мовы, заслужаны дзеяч навукі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі У.В.Анічэнка – адзін са старэйшых і вопытнейшых вучоных нашага універсітэта. У мінулым годзе Уладзімір Васільевіч адзначыў свой 75-гадовы юбілей. Але ўзрост – не перашкода яго нястомнай і плённай навукова-педагагічнай дзейнасці. Працаздольнасці шырока вядомага мовазнаўцы могуць пазайздросціць многія маладыя навукоўцы.

Сёння Уладзіміру Васільевічу ёсць чым ганарыцца. Сярод яго былых вучняў – 2 дактары і звыш 20 кандыдатаў філалагічных навук. Пастаянна пашыраецца і спіс друкаваных прац вучонага. Летась ён стаў аўтарам і сааўтарам пяці выданняў.

Юрфак: ступені росту

# СТВАРАЕЦЦА КАБІНЕТ КРЫМІНАЛІСТЫКІ

Праблема падрыхтоўкі спецыялістаў у наш час стаіць надзвычай востра. Перанасычэнне рынку працы спецыялістамі пэўнай прафесіі прыводзіць да таго, што павышаецца попыт на больш кваліфікаваных работнікаў. Менавіта таму вну рэспублікі, у тым ліку і наш універсітэт, імкнуцца рознымі шляхамі павысіць узровень адукацыі на сваіх факультэтах.

У кожнага з іх у гэтым плане свае цяжкасці і кіраўніцтва спраўляецца з імі па-свойму. У найбольш цяжкім становішчы, на мой погляд, знаходзіцца юрыдычны факультэт. Ён стаў самастойным параўнальна нядаўна – у мінулым годзе, таму шмат неабходна зрабіць для эфектыўнасці навучальнага працэсу і паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Трэба аддаць належнае кіраўніцтву факультэта. За мінулы год была праведзена вялікая работа ў розных накірунках: выдзелены 3 кафедры, праведзены змены ў выкладчыцкім саставе з мэтай паляпшэння якасці выкладання, прыняты меры па выхаваўчай рабоце. Бібліятэка пакрысе папаўняецца разнастайнай юрыдычнай літаратурай, што неабходна ўвогуле і менавіта ў дадзены момант, паколькі ў заканадаўстве адбываюцца радыкальныя і дастаткова аб'ёмныя змены.

Асноўныя цяжкасці ў ажыццяўленні пазітыўных зменаў узнікаюць з-за спецыфікі прафесіі юрыста. Справа ў тым, што для вывучэння пэўных прававых дысцыплін адной тэорыі недастаткова, неабходны практычныя навыкі. Але і гэтыя праблемы вырашаюцца факультэтам.

На пачатку гэтага навучальнага года было прынята рашэнне аб стварэнні кабінета крыміналістыкі. Ужо выдзелена асобная аўдыторыя, але работа ідзе марудна з-за недахопу матэрыяльных сродкаў.

Кабінет будзе ўяўляць сабой своеасаблівую аўдыторыю, у якой студэнты, накапіўшы неабходны тэарэтычны матэрыял, змогуць замацаваць яго на практыцы: зняць адбіткі пальцаў, зрабіць аналіз адбітка следа нагі, правесці фотаздымку. У студэнтаў таксама з'явіцца магчымасць зрабіць габітаскапічную экспертызу, працэс якой звычайна ідзе даволі весела і жвава. (Для недасведчаных: габіталогія – навука аб знешнім выглядзе чалавека). На падставе вынікаў гэтай экспертызы ствараюцца фотаробаты і апісанні людзей, якія па тых ці іншых прычынах знаходзяцца ў вышуку.

Значэнне кабінета крыміналістыкі для павышэння ўзроўню адукацыі студэнтаў цяжка пераацаніць. Многія з выпускнікоў юрфака ідуць працаваць у міліцыю, пракуратуру, экспертна-крыміналістычныя цэнтры, і для іх работы навыкі абыходжання з фотаапаратурай, матэрыяламі, прыборамі для правядзення розных экспертыз з'яўляюцца вельмі неабходнымі. Мяркуецца, што кабінет крыміналістыкі будзе прызначацца для практычных заняткаў, а яго работай будзе кіраваць загадчык.

Як ужо адзначалася, кабінет крыміналістыкі, яго належнае абуладкаванне патрабуе значных матэрыяльных затрат. Факультэт ужо зрабіў пэўныя крокі ў гэтым накірунку: дэканатам праведзены гутаркі з начальнікамі аддзелаў міліцыі, пракуратуры аб прадастаўленні тэхнічных сродкаў для аснашчэння кабінета і афармлення стэндаў.

Будзем спадзявацца, што ў хуткім часе ў студэнтаў з'явіцца магчымасць папрацаваць з дактаплёнкай, набыць навыкі ў практычным вывучэнні слядоў злачынства і пафатаграфаваць у задавальненне сабе і на карысць навучальнаму працэсу.

**Анастасія ЛУК'ЯНАВА,**
**студэнтка III курса**
**юрыдычнага факультэта.**

Фотарэпартаж

# У СЕСІІ – СВАЕ ЗАКОНЫ





На гэтых здымках – уся гама пачуццяў студэнтаў, якія яны перажываюць у час экзаменацыйнай сесіі: ад напружання і хвалявання перад выбарам экзаменацыйнага білета, сур'ёзнасці і сканцэнтраванасці ў час адказу перад выкладчыкам да раднаснага задавальнення, палёгкі, што ў заліковай кніжцы стаіць станоўчая адзнака.

Зараз студэнцкая моладзь заслужана адпачывае на зімовых канікулах, схаваўшы далей з вачэй усё, што хоць чым-небудзь нагадвала б аб нядаўніх выпрабаваннях на веды – канспекты, падручнікі, шпаргалкі.

Гэтыя моманты сесіі, якія вы бачыце на здымках, — цяпер ужо гісторыя. Але можна сказаць, для многіх студэнтаў павучальная, што прымусіць некаторых пераасэнсаваць нешта ў сваім разуменні, што такое вучоба ў вну.

Калі былі ў кагосьці "правалы" на экзаменах, вінаватых шукаць не трэба – прычына, перш за ўсё, у сваёй асабістай неарганізаванасці ці ва няўменні пераадолець хваляванне і страх, якія перашкаджаюць ясна думаць і выкладаць свае думкі. Вучыцца валодаць сабой – гэта таксама цэлая навука, якую трэба спасцігаць.



**На здымках: Святлана Стаўрапольская, першакурсніца біялагічнага факультэта на экзамене па хіміі, які прымала дацэнт В.Р.Свірыдзенка, атрымала выдатную адзнаку (уверсе). Вышэйшым балам ацэнены адказ па прадмету "Практыка вуснай мовы" студэнткі гр.А-11 спецыяльнасці "Англійская мова" Ганны Кучаравай. Лёгкі білет, дзе ён?..**

**Фота У.Чысціка.**

Навучанне па міжнароднай праграме

# ШВЕДСКІЯ ДЫПЛОМЫ – БЕЛАРУСКІМ СТУДЭНТАМ

**Эфектыўнасць прыродаахоўных мерапрыемстваў узрастае ў шмат разоў, калі яны праводзяцца з улікам заканамернасцей функцыяніравання буйных экалагічных сістэм – геасістэм. Прыкладам структурнай геасістэмнай адзінкі з'яўляецца водазборны басейн. Басейн Балтыйскага мора, у межы водазбору якога ўваходзіць і Беларусь, у апошнія дзесяцігоддзі адчувае імкліва ўзрастаючы прэс антрапагеннага ўздзеяння, у выніку чаго зараз Балтыйскае мора пераўтварылася ў адно з самых забруджаных у свеце.**

Многія прыродаахоўныя праекты, якія ажыццяўляюцца ў Балтыйскім рэгіёне, уключаюць міжнародныя навукова-даследчыя праграмы, адукацыйныя мерапрыемствы. Прыкладам апошніх з'яўляецца стварэнне Балтыйскага універсітэта — міжнароднай праграмы, у адпаведнасці з якой больш 80 універсітэтаў 14 краін Балтыйскага рэгіёна прапаноўваюць вучэбныя курсы універсітэцкага ўзроўню для студэнтаў розных гадоў навучання. Курсы складаюцца з тэлевізійных урокаў, вучэбных дапаможнікаў, семінараў на месцах навучання, праглядаў відэафільмаў. Праграма каардынуецца Упсальскім універсітэтам (Швецыя).

Набыццё глабальнага экалагічнага мыслення, засваенне новых ведаў як мага большай колькасцю студэнтаў краін Балтыйскага рэгіёна на аднолькава высокім універсітэцкім узроўні і ў даволі кароткія тэрміны — асноўнае прызначэнне Балтыйскага універсітэта. Яго праграма ўключае некалькі курсаў: "Балтыйскае мора і яго навакольнае асяроддзе", "Народы Балтыкі", "Устойлівы Балтыйскі рэгіён", "Устойлівы водны менеджмент". Іх мэта — даць звесткі аб асноўных фактах і ўяўленне аб прычынах пагаршэння стану навакольнага асяроддзя ў Балтыйскім рэгіёне, аб прыродаахоўнай палітыцы і супрацоўніцтве ў ім, і інш.

У рамках праграмы Балтыйскага універсітэта створана міжрэгіянальная інфармацыйная сетка для студэнтаў. Яна дазваляе пашырыць кантакты і магчымасці для абмеркавання розных тэм, абмену вопытам, планавання студэнцкіх канферэнцый, летніх лагераў і г.д.

У Балтыйскім універсітэце шырока прадстаўлены беларускія вну. У рэспубліцы ёсць Беларускі нацыянальны цэнтр праграмы Балтыйскага універсітэта — Беларуская політэхнічная акадэмія (г.Мінск). 26 універсітэтаў з'яўляюцца ўдзельнікамі Нацыянальнай сеткі, больш за 40 выкладчыкаў чытаюць курсы праграмы Балтыйскага універсітэта. Па ёй у 1998-99 гг. навучалася 1136 студэнтаў, з іх 56 паспяхова вытрымалі заключны экзамен і атрымалі дыпломы.

ГДУ імя Ф.Скарыны ўваходзіць у лік універсітэтаў-удзельнікаў Нацыянальнай сеткі праграмы Балтыйскага універсітэта. Паміж ім і Упсальскім універсітэтам заключаны Дагаворы аб супрацоўніцтве ў рамках праграмы БУ. На падставе аднаго з іх у 1998-99 гг. група студэнтаў 4-5 курсаў і два аспіранты кафедры заалогіі і аховы прыроды біялагічнага факультэта пад кіраўніцтвам аўтара гэтых радкоў займаліся па вучэбнаму курсу "Балтыйскае мора і яго навакольнае асяроддзе". Планам работы прадугледжвалася вывучэнне матэрыялаў такіх урокаў, як "Жыццё ў Балтыйскім моры", "Прамысловыя забруджвальнікі і таксіканты", "Прыродаахоўнае заканадаўства і эканоміка", "Водазабеспячэнне і ачыстка сцёкавых вод у Балтыйскім рэгіёне" і інш. На семінарскіх занятках студэнты актыўна абмяркоўвалі ключавыя пытанні ўрокаў, прымалі ўдзел у дыскусіях, праглядалі відэафільмы. Па праграме Балтыйскага універсітэта студэнты 4 курса біяфака Наталля Марцуль, Міхаіл Шалупаеў і Аляксандр Будаў летам 1998 г. працавалі ў Міжнародным маладзёжным экалагічным лагеры, арганізаваным Лігай дабраахвотнай працы моладзі (г.Магілёў). Разам з іншымі студэнтамі яны займаліся добраўпарадкаваннем берагоў і расчысткай рэчышча малой рэчкі Дубровінкі. Студэнты, якія навучаюцца па праграме БУ, прынялі актыўны ўдзел у І-ай Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Экалогія і моладзь", што праводзілася на кафедры заалогіі і аховы прыроды ў сакавіку 1998 г. У выступленнях студэнтаў на канферэнцыі выкарыстоўвалася інфармацыя, якая была прадстаўлена ў матэрыялах, атрыманых з Балтыйскага універсітэта. У чэрвені мінулага года чатыры студэнты і два аспіранты паспяхова здалі экзамен і атрымалі дыпломы-сертыфікаты Упсальскага універсітэта (**на здымку**).




У цяперашні час на кафедры заалогіі і аховы прыроды праходзіць навучанне новая група студэнтаў па курсу "Устойлівы Балтыйскі рэгіён". Яе куратарамі з'яўляюцца аўтар публікацыі і асістэнт кафедры А.В.Крук, які ў час вучобы ў аспірантуры займаўся па названаму вышэй курсу, здаў экзамен і мае адпаведны дыплом. Плануецца наш удзел у навучанні студэнтаў па курсу "Устойлівы водны менеджмент", які павінен быць на геолага-геаграфічным факультэце пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў А.Ю.Трацэўскай.

Экалагічная адукацыя — бясконцы працэс, ён павінен быць прадстаўлены на многіх узроўнях. Мы спадзяемся, што тыя веды, якія набудуць нашы студэнты на занятках па праграме Балтыйскага універсітэта, спатрэбяцца ім у будучым.

**І.РАСАШКА,**
**заг.кафедры заалогіі і аховы прыроды, дацэнт.**

С семинара психологов



# ПУТЬ К УСПЕХУ

Наш мир уже буквально наводнен бесчисленными руководствами, советами и рецептами, которые на все лады учат нас добиваться успеха. Однако на свете до сих пор существует масса людей, от природы наделенных талантом мастерить свой маленький "персональный ад". Конечно, быть неуспешным в наше время — не проблема, это доступно каждому. Об этом говорит рост неврозов, депрессий, суицидов и т.д. Тем не менее, перед психологами стоит задача помогать тем, кто нуждается в этом отношении в помощи и поддержке.

Этому был посвящен психологический семинар "Дао успеха", проходивший на базе Гомельского университета им. Ф.Скорины. В семинаре принимали участие преподаватели вузов, а также психологи и психотерапевты из Минска, Гомеля, Могилева, Жодино, психологи из районных городов Гомельской области: Мозыря, Жлобина, Речицы и др.

Выступления участников семинара были очень интересными, глубокими и оригинальными. Активный диспут вызвало выступление доцента кафедры психологии ГГУ Г.Гатальской "Психология успеха: подходы Запада и Востока". Оно затронуло очень интересную тему влияния славянской ментальности на успешность в жизни, понимание успеха как такового, имеющего особенные специфические отличия от западной традиции. Это сообщение содержало очень интересные примеры и высказывания как отечественных философов, психологов, так и западных.

В ходе семинара затрагивались вопросы, связанные с успешностью работы психолога. В этом отношении интерес представляли выступления В.Филипенко, психотерапевта из Минска, доцента кафедры прикладной психологии БГПУ им. М.Танка, О.Силявского, директора лаборатории тренинга "Практикум" из Минска и А.Крыленко, старшего преподавателя кафедры акмеологии ГОИПК.

Актуальная тематика встречи психологов носила не только профессиональный, но и мировоззренческий, познавательный, нравственный и воспитательный характер.

Психологи, учителя и студенты активно участвовали в работе круглого стола, организатором которого была Г.Гатальская. Развернулась настоящая дискуссия, затрагивающая проблемы успеха и отношения к нему с различных мировоззренческих позиций.

На семинаре, что уже стало традицией, была представлена замечательная выставка картин гомельских художников и выставка психологической литературы.

Это был один из тех семинаров, который не оставляет равнодушным ни одного участника, дает стимул в работе, влечет к поискам новых профессиональных методов и направлений, да и просто дает работу мысли, душе, помогает подняться на ступень выше в плане личностного и духовного роста, понимания себя и других.

**Лариса ЛАРКИНА,**
**психолог музыкально-педагогического колледжа им.Л.С.Выготского.**

**Унікальная кніжная серыя**



# ЗАЛАТАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

**На Беларусі ўпершыню ў гісторыі распачата выданне ўнікальнай 200-томнай кніжнай серыі "Беларускі кнігазбор".**

У гэтае серыйнае выданне ўвойдзе ўсё лепшае, усё самае важнае, што было створана на беларускай зямлі ад старажытнасці да нашых дзён. Апрача беларускіх аўтараў тут будуць прадстаўлены пісьменнікі іншых краін, якія так ці інакш былі звязаны з Беларуссю і цікава расказалі пра яе ў сваіх кнігах. У серыі раскрыецца ўся тысячагадовая гісторыя нашай Бацькаўшчыны.

"Беларускі кнігазбор" складаецца з дзвюх серый. У першую ("бардовую") увойдуць творы мастацкай літаратуры, у другую ("зялёную") — гісторыка-літаратурныя помнікі. Апрача выдадзеных ужо кніг чытача чакаюць сустрэчы з жывым словам Кірылы Тураўскага, Францішка Скарыны, Сымона Буднага, Міхалона Ліцвіна, Міколы Гусоўскага, Яна Вісліцкага, Сімяона Полацкага і іншых славутых пісьменнікаў старажытнасці. Упершыню шырока будзе паказана літаратура Беларусі і пра Беларусь XVIII — XIX ст. Выйдуць аднатомнікі твораў Францішка Князьніна, Францішка Багамольца, Юльяна Нямцэвіча, Адама Міцкевіча, Юзафа Крашэўскага, Евы Фялінскай, Яна Баршчэўскага, Ігната Дамейкі, Элізы Ажэшка, Адама Плуга, Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча, Аляксандра Ельскага, Паўла Шпілеўскага, Фадзея Булгарына і іншых. Вялікае месца зойме тут і айчынная літаратура XX ст., пачынаючы ад творчасці Ядвігіна Ш., Янкі Купалы і заканчваючы творамі нашых сучаснікаў. Зацікавяць чытача і гісторыка-літаратурныя помнікі — "Гісторыя літоўскага народа" Тэадора Нарбута, "Апісанне Барысаўскага павета" Яўстаха Тышкевіча, "Беларускія старажытнасці" Аляксандра Семянтоўскага, "Віцебская Беларусь" Мікалая Нікіфароўскага, "Вілія і яе берагі" Канстанціна Тышкевіча, "Віцебская даўніна" Аляксея Сапунова, "Беларускі народ" Міхала Федароўскага, "Беларусы-палешукі" Аляксандра Сержпутоўскага, "Славяншчына перад хрысціянствам" Зарыяна Даленгі-Хадакоўскага, "Беларусы" Яўхіма Карскага, "Народная культура славян" Казіміра Машынскага, "Смаленскі этнаграфічны зборнік" Уладзіміра Дабравольскага, "Рэчыцкае Палессе" Чэслава Пяткевіча, "Зямля пад белымі крыламі" Уладзіміра Караткевіча і многія іншыя.

Той, хто пачне збіраць кнігі гэтай прэстыжнай серыі, стане ўладальнікам каштоўнага скарбу — невычэрпнай крыніцы ведаў і духоўнага ўзбагачэння для кожнай сям'і.

На сённяшні дзень выйшлі ўжо аднатомнікі выбраных твораў Яна Чачота, Максіма Багдановіча, Вацлава Ластоўскага, Уладзіміра Жылкі, Яна Баршчэўскага, Кастуся Каліноўскага, а таксама зборнікі — "Беларускія летапісы і хронікі", "Філаматы і філарэты".

Толькі што з'явіліся на паліцах кнігарняў адзін за адным два чарговыя тамы "Беларускага кнігазбору" — "Выбраныя творы" Янкі Брыля, дзе змешчаны яго лепшыя апавесці, апавяданні, эсэ і мініяцюры, і "Выбраныя творы" Ёгана Вольфганга Гётэ, 250-гадовы юбілей якога адзначае цяпер сусветная грамадскасць. Кнігу вялікага нямецкага паэта і філосафа склалі яго бессмяротныя вершы і балады, раман "Пакуты маладога Вертэра", трагедыя "Фауст", а таксама лібрэта оперы "Фауст", напісанае аўтарам спецыяльна для беларускага кампазітара Антонія Радзівіла і нядаўна пастаўленае на сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Аднатомнік выбраных твораў Ёгана Вольфганга Гётэ распачынае новую, трэцюю серыю "Беларускага кнігазбору" — "замежная літаратура".

На жаль, тыражы кніг "Беларускага кнігазбору" не вялікія. Таму чытачам, якія збіраюць кнігі серыі для сваіх дамашніх бібліятэк, варта не марудзіць з іх набыццём.

**(Беларускі літаратурны фонд).**

# ВОІНАЎ Мікалай Мікалаевіч



Калектыў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны панёс вялікую страту. На 57-м годзе жыцця нечакана перастала біцца сэрца прарэктара па вучэбнай і выхаваўчай рабоце, кандыдата філалагічных навук, дацэнта Воінава Мікалая Мікалаевіча.

Яго ведалі, любілі і паважалі як чалавека вялікай душы, шчырага, добразычлівага, і як сапраўднага прафесіянала, добрага арганізатара, умелага кіраўніка на ўсіх участках работы, на якіх яму давялося працаваць.

М.М.Воінаў нарадзіўся 14 ліпеня 1943г. у п.Станкі Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1965г. закончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П.Чкалава, працаваў настаўнікам Хутарской СШ Светлагорскага раёна. Пасля службы ў радах Савецкай Арміі і дэмабілізацыі працягваў работу ў гэтай жа школе на пасадзе завуча, затым паступіў у аспірантуру ГДУ. Пэўны час рэдагаваў газету "Гомельскі універсітэт".

Добрыя арганізатарскія здольнасці, высокія дзелавыя якасці М.М.Воінава праявіліся ў час яго работы на пасадах лектара, інструктара аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага гаркома Кампартыі Беларусі, намесніка загадчыка ідэалагічнага аддзела Гомельскага абкома КПБ.

Свой выдатны педагагічны талент М.М.Воінаў паспяхова рэалізоўваў на ніве народнай адукацыі: быў дырэктарам Гомельскага прафтэхвучылішча №126 народных мастацкіх промыслаў, Гомельскага педагагічнага вучылішча, загадчыкам аддзела навуковых і вучэбных устаноў абкома партыі. Ён з'яўляўся руплівым гаспадаром, умелым выхавацелем, ініцыятарам цікавых пачынанняў і традыцый.

Амаль 10 гадоў яго жыцця звязаны з Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф.Скарыны. Тут ён працаваў прарэктарам па завочнаму навучанню, вучэбнай рабоце, а з 1995г. — па вучэбнай і выхаваўчай рабоце. Да службовых абавязкаў адносіўся з пачуццём вялікай адказнасці, выконваў іх на высокім прафесійным узроўні.

М.М.Воінаў выступаў актыўным прапагандыстам станаўлення і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці, садзейнічаў росту нацыянальнай самасвядомасці грамадзян нашай краіны і асабліва яе моладзі.

За шматгадовую плённую працу па прапагандзе дасягненняў у галіне культуры, літаратуры і мастацтва ўказам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь М.М.Воінаў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Будучы прарэктарам, М.М.Воінаў працягваў павышаць свой навуковы патэнцыял. Ён — аўтар вучэбнага дапаможніка, манаграфіі, сааўтар кніг па літаратуразнаўству, яго пяру належыць больш за 50 апублікаваных навуковых артыкулаў.

Цяжка змірыцца з думкай, што Міколы Мікалаевіча ўжо няма сярод нас, і мы не ўбачым, як заўсёды, яго добразычлівую ўсмешку, не пачуем яго падбадзёрваючыя словы, не атрымаем яго добрую параду.

Светлая памяць аб М.М.Воінаве, выдатным арганізатару вучэбнага працэсу, выхавацелю студэнцкай моладзі, вядомым навукоўцу, Чалавеку з вялікай літары назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

**ГРУПА ТАВАРЫШАЎ.**

*Мир цветов — мир прекрасного*

# ГРАЦИОЗНОСТЬ И ЭКЗОТИКА

***Они особенно радуют в длинные зимние вечера, когда за окном метель и вьюга, а в вазе — кусочек жаркого тропического леса — цветок фламинго.***

Так называют антуриумы — растения, у которых соцветия настолько необычны по форме, что ассоциируются с птицей фламинго, имеющей розовое оперение, очень длинные ноги и такую же длинную шею с массивным клювом. Название рода Антуриум в переводе с греческого означает хвост за форму соцветия многих видов рода.

Цветки у антуриумов мелкие белые или желтые, собраны в соцветие длиной до 18 см, которое может быть прямым или изогнутым, как шея у птицы. Всю красоту растению придает покрывало (присоцветный лист). По форме оно может быть эллиптическим, широкоовальным, кожистым, отгибающимся или приподнятым, с красивой системой жилок. Цвет варьирует от зеленого, белого, розового до багряно-красного, малинового со всеми переходными оттенками. В сумраке тропических лесов Америки, где обитают антуриумы, окраска присоцветного листа привлекает опылителей.

Выращивать антуриумы в теплицах начали с середины XIX в. Наибольшее распространение в культуре получили такие виды, как Антуриум Андре, А.Шерцера и А.Хрустальный. К настоящему времени разработаны технологии получения срезки антуриумов круглый год. Освоена и их горшечная культура.

Букет из антуриумов считается дорогим и оригинальным подарком, он производит сильное впечатление. К одному или нескольким соцветиям антуриумов добавляют лишь аранжировочную зелень. В композициях антуриумы сочетают с другими дорогими цветами — розами, амариллисами, при этом антуриумы возвышаются над ними, как птицы на длинных ногах. Антуриумы обычно преподносят в особо ответственных случаях людям, умеющим оценить экзотическую красоту тропических растений, с развитым воображением, тонко чувствующим природу. В срезке антуриумы стоят больше месяца. Помещают их в дорогие вазы — хрустальные, металлические ручной чеканки.

**Р.МАРКЕЛОВА,**
**доцент кафедры ботаники и физиологии растений.**

**Дмитрий ЛИНКОВ,**
**студент 5-го курса исторического факультета.**

## ГОРОДСКАЯ ЗИМА

*Падает, падает, падает снег*
*И прерывается времени бег.*
*Хлопья тяжелые с неба летят,*
*И — на асфальт, и — на асфальт.*
*Медленно время уходит в тиши,*
*И — ни души, кругом — ни души.*
*Только снежинки в небе кружат,*
*Падают, тают и снова летят.*
*Режет глаза непривычный контраст —*
*На белом поле — черный асфальт.*
*Низкое небо, вал облаков, —*
*В них растворяются крыши домов,*
*Серых домов, серых домов...*
*Все поглотила снежная мгла.*
*Это — зима, городская зима.*

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— тэорыі і практыкі англійскай мовы — ст.выкладчыка;
— бухгалтарскага ўліку, кантролю і АГД — ст.выкладчыка;
— беларускай літаратуры — дацэнта;
— падрыхтоўкі да паступлення ў вну і прафарыентацыі — асістэнта;
— фізвыхавання і спорту — ст.выкладчыка (3).

Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць па адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, увесь калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў глыбока смуткуюць з выпадку раптоўнай смерці прарэктара па вучэбнай і выхаваўчай рабоце **ВОІНАВА** Мікалая Мікалаевіча і выказваюць сваё спачуванне яго родным і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат біялагічнага факультэта, калектыў кафедры заалогіі і аховы прыроды выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **ВЕРАМЕЕВУ** Васілю Мікалаевічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат фізічнага факультэта, калектыў кафедры оптыкі выказваюць глыбокае спачуванне прафесару кафедры **ГІРГЕЛЮ** Сяргею Сяргеевічу з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

В.а.рэдактара Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 12.
Падпісана да друку 26.01.2000 г.